УДК 914 (476)+911:312 (476)

# ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ

**Шаруха І.М.**, МДУ імя А. Куляшова, г. Магілёў

**Шарухо И.Н. География белорусской диаспоры**. В статье анализируется история формирования белорусской диаспоры по выделенным этапам, рассматриваются виды эмиграции. Анализируются причины эмиграций, особенности пространственной дифференциации диаспоры.

**Sharukho I.N. The geography of the Belarus Diaspora**. The article analyzes the history of the formation of the Belarusian Diaspora on the dedicated stages, discusses the types of emigration. The author analyzes the causes of emigration, especially of the spatial differentiation of the Diaspora.

**Уступ.** Дыяспара – адносна новы тэрмін у палітыка-геаграфічным лексіконе. Упершыню тэрмін сталі выкарыстоўваць ў дачыненні да габрэйскага народа, затым – да палякаў (польская дыяспара налічвае больш за 13 млн.), армян (больш за 3 млн). Адносіны з мітраполіяй могуць ажыццяўляцца ў аспектах: маральна-прававым, палітычным, эканамічным, культурным. Чалавек мае права выбіраць сабе сам месца свайго жыхарства (Усеагульная Дэкларацыя правоў чалавека – Арт. 13, 14), адсюль – магчымасць фарміравання дыяспар.

Беларусь – класічная краіна эмігрантаў: з амаль 12 млн беларусаў (7957 тыс. жывуць у Рэспубліцы Беларусь, перапіс 2009 г.; беларуская нацыя). Этнічных беларусаў па-за межамі радзімы пражывае 4 млн. (народнасць; з нашчадкамі ў другім і трэцім пакаленнях – больш за 10 млн.) у 63 краінах свету.

**Асноўны змест.** Спрадвеку вядома эканамічная, шлюбная, канфесійная і прымусовая эміграцыі. Дэмакратычны рэжым у ВКЛ і Рэчы Паспалітай спрыяў вольнаму перамяшчэнню сваіх грамадзян, эміграцыі.

За XIII–XVI стст. толькі ў татарскія палоны з Беларусі было выведзена ад 250–500 да 1000 тыс. чал. На працягу XV-XVII стст. грамадзяне ВКЛ часцей за ўсё выязджалі ў «Святую Рымскую імперыю», Італію, Чэхію, Францыю, Іспанію, Галандыю, дзе паступалі на службу або падвышалі свой адукацыйны ўзровень, садзейнічалі распаўсюджванню навукі.

Першая буйная хваля эміграцыі прыходзіцца на кан. XVI і XVII ст. як рэакцыя на шматлікія войны з Маскоўскай дзяржавай (у выніку беларусы сталі актыўна рассяляцца па Еўропе, Сібіры, Амерыцы), узмацненне царкоўнага і феадальнага прыгнёту, ушчамленне правоў і вольнасцей. У часы паўстання Багдана Хмяльніцкага, вайны 1654–1667 гг., затым Вялікай Паўночнай вайны (1700–1721) насельніцтва Беларусі ад ваенных і міграцыйных страт скарачалася на 50% [5, с. 288]. Асабліва шмат беларусаў – больш за 300 тыс. – было запалонена і расселена ў Масковіі пасля вайны 1654–1667 гг. З 1672 г. у маскоўскай Мяшчанскай Слабадзе абаснавалася 600 сем'яў беларусаў, якія будавалі Новадзевічы манастыр, Пакроўскі сабор, Успенскую царкву, Каломенскі, Данскі і Нова-Ерусалімскі манастыры, працавалі ў Збройнай палаце. У II пал. XVII ст. беларусы складалі да 20% насельніцтва Масквы. Выхадцамі з Беларусі былі вядомыя баяры (Бельскія, Мсціслаўскія, Міласлаўскія, Глінскія /з гэтага роду паходзіла маці Івана Жахлівага/, Друцкія і інш.). Шматлікія перасяленцы і іх нашчадкі сталі пачынальнікамі геаграфічнага і этнаграфічнага вывучэння новых каланізаваных Расіяй тэрыторый (А. Каменскі, Л. Сяніцкі і інш.). Шматлікія сяляне сыходзілі ў Сеч, за дняпроўскія парогі не толькі з-за прыгнёту, але і ў неўрадлівыя гады (1588, 1601–1602, 1655, 1690 і інш.), ад эпідэмій (у XVI–XVIII стст. – больш за 80).

Наступны этап эміграцыі – 1772–1795 гг. – пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Тады ж сфарміравалася першая магутная хваля палітычнай эміграцыі – пасля паразы вызвольнага руху 1794 г. і заняцця Варшавы войскамі А. Суворава дваранства, шляхта ў вялікай колькасці пакідалі Беларусь. Тады выехалі паводле самых сціплых падлікаў да 50 тыс.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чал. Ад 10 да 20 тыс. выехалі ў 1812-1813 гг., каля 10 тыс. з прычыны канфесійных ганенняў, 5–10 тыс. – пасля паўстання 1830-1831 гг., больш за 10 тыс. – пасля паўстання 1863-1864 гг.

Эканамічныя праблемы спарадзілі працоўную эміграцыю, асабліва значную ў 1897–1914 гг. У 1897 г., па-за межамі беларускіх губерняў пражывала каля 500 тыс. беларусаў. Эмігранты ўдзельнічалі ў вывучэнні далёкіх рэгіёнаў Расіі (І. Чэрскі, Э. Пякарскі, А. Янушкевіч, Б. Дыбоўскі і інш.). Першая хваля масавай эканамічнай міграцыі дала больш за 700 тысячную плынь, галоўным чынам у Сібір, яшчэ 500–800 тыс. па-за межы Расійскай імперыі – у ЗША, Парагвай, Аргентыну, Нямеччыну, Францыю, Аўстралію, нямецкія, французскія калоніі [2]. Да Першай Сусветнай вайны на захад выехала, паводле дадзеных праф. В. Цітова (дарэчы, выпускніка гісторыка-геаграфічнага факультэта Магілёўскага педінстытута) 600 тыс. [6], Г. Сяргеевай і Т. Папоўскай – да 800 тыс. [5, с. 289], В. Кіпеля [3] – не менш за 900 тыс. (дарослых). Толькі праз Лібаву ў 1912 г. у ЗША выбыла 58,5 тыс. беларусаў. Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, у 1861–1913 гг. выехала 1387 тыс. беларусаў (без уліку дзяцей) [8].

Комплекс праблем выклікаў змешаную міграцыю ў 1914–1921 гг. Толькі ў жніўні 1914- увесну 1915 гг. 318 тыс. беларусаў патрапілі ў палон або зніклі без звестак. У 1915 г. паводле сведчання праф. В. Ігнатоўскага, каля 2 млн. беларусаў перасялілася ў цэнтральныя і ўсходнія рэгіёны Расіі. Па дадзеных беларускіх дэмографаў, 246 тыс. беларусаў і эвакуіраваных не вярнуліся па заканчэнні вайны ў родныя месцы, яшчэ 122 тыс. выехалі па-за межы Расіі.

У 1917–1920-х гг. пасля завяршэння кароткай гісторыі БНР, разгрому нацыянальных арганізацый, у Польшчу, Нямеччыну, ЗША, Чэхаславакію пераехалі не меней за 15 тыс. чал., у асноўным інтэлігенцыя.

Наступныя этапы эміграцыі: 1924–1939 – працоўная з тэрыторыі Ўсходняй і Заходняй Беларусі – у 1920–1930-я гг. падчас індустрыялізацыі, культурнага будаўніцтва, здзяйснення планаў першых пяцігодак беларусы БССР выязджалі ў Расію, Украіну, Сярэднюю Азію на будаўніцтва каналаў, прадпрыемстваў (150 тыс.; перапіс 1926 г.: у РСФСР пражывалі 722 тыс. беларусаў [4, с. 127], у 1926–1941 гг. выехала 500 тыс. беларусаў БССР; у 1921–1939 гг. з Заходняй Беларусі выехалі ў Амерыку, Аўстралію ад 200 [4] – 250 [5] да 600 [6] тыс. беларусаў. Пры раскулачванні сасланы больш за 250 тыс. чал. У 1939–1941 гг. дэпартаваны 100 тыс. з Заходняй Беларусі. В. Цітоў адзначае, што на 1925–1939 гг. прыходзіцца новая хваля беларускай эміграцыі з Заходняй Беларусі ў Паўднёвую Амерыку і Канаду. Першае месца па колькасці эмігрантаў у гэты час займала Бразілія (350 тыс.), затым Аргенціна (120; з іх палова ў Буэнас-Айрэсе), Уругвай (60), Парагвай (60), Чылі (10). Шмат перасяленцаў па шляху ў Амерыку на некаторы час затрымаліся ў краінах Еўропы. У прыватнасці, у 1930-х гг. у Францыі жылі больш за 20 тыс. беларусаў.

У 1929–1941 гг. – падчас рэпрэсій («ворагамі» сталі ад 0,7 да 2,0 млн. беларусаў), паводле дадзеных Я. Найдзюка і І. Касяка, больш 1,5 млн. беларускіх сялян [7, с. 328] былі арыштаваны, расстраляны, дэпартаваны. У 1939–1940 гг. пры передачы Віленскага края Літве у ёй засталіся больш за 500 тыс. беларусаў. У 1941 г. на Волгу, Урал, у Сібір, Казахстан эвакуіравалася больш за 1,5 млн. чал.; у 1941–1944 гг. немцы вывезлі на працу ад 260 да 700 тыс. (у В. Цітова – 380 тыс.; афіцыйныя дадзеныя – 400 тыс. [5, с. 290]. Разам з калабарантамі ў Нямеччыну выехалі ад 200 да 400 тыс. Усяго падчас рэпатрыяцый вярнуліся на Беларусь 520 тыс. [5, с. 290]. Шмат беларусаў, якія знаходзіліся ў лагерах Нямеччыне, пасля 1945 г. выехалі ў Францыю, Бельгію, Вялікабрытанію, ЗША, Канаду, Аўстралію. У ЗША пасяліліся каля 50 тыс. чал., столькі ж – у Канадзе, дзясяткі тысяч – у Нямеччыне, Францыі, Аўстраліі [1].

У 1945 г., пры передачы Польшчы Беласточчыны (17 раёнаў; часткі Брэстчыны – 3 раёны) за мяжой апынуліся ад 250 да 400 тыс. беларусаў. У 1945–1947 гг. падчас узаемных тэрытарыяльных з Польшчай абменаў, у Беларусь пераехалі 36, а выехалі 274 тыс. чал.

Эміграцыя працягвалася ў 1947–1952 гг. (10 тыс. выехалі з Заходняй Беларусі), у 1945–1953 гг. (пасляваенныя рэпрэсіі), у 1950–1970-я гг. (працоўныя эміграцыі – цаліна, БАМ, Поўнач). У 1950–1965 гг. з БССР выехалі на 1175 тыс. больш, чым прыбылі. Выязджалі беларусы і габрэі, а прыязджалі пераважна рускія, што прывяло да размыву тытульнай нацыі, разбурэнню беларускіх традыцый, укладу жыцця, псіхалогіі, нацыянальнага традыцыйнага культурнага ландшафту.

Новы этап – 1986–1990-я гг. – эміграцыя пасля аварыі на ЧАЭС і распаду СССР. У сувязі з распадам СССР у новых незалежных дзяржавах апынуліся 2130 тыс. беларусаў [5, с. 290]. Дэмакратызацыя жыцця краіны прывяла да новых хваляў эміграцыі. Пікі эміграцыі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прыйшліся на 1990, 1994 гг., калі выехала адпаведна 136 (у т.л. 97% у Ізраіль) і 57 тыс. чал. Штогадовая эміграцыя ў 1990–2000 гг. складала ў сярэднім да 30 тыс. чал./год.

За постчарнобыльскі перыяд выехалі больш за 500 тыс. (у т.л. у 1994–2004 гг. каля 230 тыс.). Найбольшую ўдзельную вагу ў аб'ёме эмігрантаў займаюць краіны СНД, Ізраіль, ЗША, ФРГ. Падчас працоўнай міграцыі выбыла не менш за 250 тыс. чал. У 1992–2000 гг. у Беларусь прыехалі на сталае жыхарства 432 тыс. (у т.л. беларусаў – 201), эмігравалі ў краіны СНД 217 тыс. На сённяшні час (па розных крыніцах) ад 700 да 1100 тыс. беларусаў – гастарбайтэры.

Па афіцыйных дадзеных «у канцы XIX–1980-я гг. беларуская дыяспара складала ад 1/6 да амаль 1/3 часткі беларускай нацыі. На пачатку 1990 гг. за мяжой пражывала 3,0–3,5 млн. беларусаў» [5, с. 288], па іншых – 4,0 млн. У выніку вольнай эміграцыі з тэрыторыі Беларусі, пасля 1772 г. выехала больш за 4, прымусова-гвалтоўнай – больш за 3 млн. чал.

На пач. XXI ст. беларусаў [5, с. 291]: у Расіі – 1,2 млн. (0,8% насельніцтвы), на Украіне – 440,0 тыс. (1,9%), у Казахстане – 183,0 (1,2%), Латвіі – 120,0 (4,5), Літве – 63,0 (1,7), Эстоніі – 29,0 (1,8), Узбекістане – 29,0 (0,2), Малдове – 20,0 (0,5%). Ад 600-800 да 850-1100 тыс. аселі ў ЗША [3], больш за 200 тыс. беларусаў жыве ў Польшчы, ад 120 да 200 тыс. выхадцаў з Беларусі і беларусаў – у Ізраілі, дзясяткі тысяч – у Канадзе, Аргенціне, Бразіліі, Уругваі, Парагваі, Чылі, Вялікабрытаніі, ФРГ, Францыі, Чэхіі, Славакіі, Аўстраліі [6] і ў іншых – усяго ў 63 краінах міру (гл. табл.).

Беларусы ў свеце найбольш кампактна пражываюць на гістарычных беларускіх землях Польшчы (Беласточчына), у этнакантактных зонах з Расіяй, Украінай, Літвой, Латвіяй [9].

**Табліца – Колькасць беларусаў па групоўках краін свету**

| Колькасць дыяспары, чал. | Краіны |
|---|---|
| 100–500 | Абхазія, Азербайджан, Венесуэла, Венгрыя, Егіпет, Індыя, Кіпр, Куба, Нарвегія, ААЭ, Партугалія, Пуэрта-Рыка, Рэспубліка Карэя, Сербія, Славенія, Славакія, Таджыкістан, Фінляндыя, Харватыя, Чарнагорыя, Швейцарыя, ПАР, Японія |
| 500–1000 | Аўстрыя, Арменія, Балгарыя, Грузія, Данія, Кітай, Ліван, Сірыя (да грамадзянскай вайны 2012 г.) |
| 1000–3000 | Бельгія, Грэцыя, Кіргізстан, Іспанія, Італія, Нідэрланды, Швецыя |
| 3000–10000 | Вялікабрытанія, Новая Зеландыя, Туркменістан, Чэхія, Чылі, Францыя |
| 10000–100000 | Аргенціна, Бразілія, Германія, Казахстан, Канада, Латвія, Літва, Малдова, Парагвай, Узбекістан, Уругвай, Эстонія |
| 100000–300000 | Аўстралія, Ізраіль, Польшча, Украіна |
| 300000–1100000 | Расія, ЗША |

Арганізацыі дыяспары ўваходзяць у склад Згуртавання беларусаў свету – ЗБС «Бацькаўшчына» (з 1990 г.; да 200 аб'яднанняў; 28 краін).

Галоўныя цэнтры зарэгістраваных арганізацый: Берыса (Аргенціна), Перт, Сідней, Мельбурн (Аўстралійскі Саюз), Брусель (Бельгія), Лондан, Манчэстэр, Брадфарт, Ковентры (Вялікабрытанія), Тэль-Авіў (Ізраіль), Берлін (Германія), Алматы, Астана, Костанай, Какшатаў, Паўладар, Петрапаўлаўск, Усць-Каменагорск (Казахстан), Квебек, Атава (Канада), Бішкек (Кіргізстан), Даўгаўпілс, Рыга (Латвія), Каўнас, Вільнюс (Літва), Кішынёў, Рыбніца, Бэлць, Ціраспаль, Камрат (Малдова), Архангельск, Вялікі Ноўгарад, Уладзівасток, Валгаград, Варкута, Варонеж, Екацярынбург, Іркуцк, Казань, Калінінград, Кемерава, Краснадар, Краснаярск, Масква, Мурманск, Ніжні Ноўгарад, Новасібірск, Омск, Арэнбург, Петразаводск, Петрапаўлаўск-Камчацкі, Санкт-Пецярбург, Саратаў, Сочы, Сургут, Сыктыўкар, Цюмень, Уфа, Яраслаўль (Расія), Нью-Ёрк, Чыкага, Вашынгтон, Кліўленд, Саўт-Рывер (ЗША), Вінніца, Данецк, Жытомір, Івана-Франкоўск, Кіеў, Кіраваград, Луганск, Львоў, Роўна, Севастопаль, Сімферопаль, Харкаў, Чарнігаў (Украіна), Прага (Чэхія), Йыхві (Эстонія).

**Высновы.** Беларусь – класічная краіна эмігрантаў: кожны трэці беларус жыве па-за межамі радзімы. Беларусы замежжа маюць розны лёс: адны патрапілі за мяжу нікуды не пераязджабчы – гэта жыхары земляў, што былі ўключаны у склад Расіі, Латвіі, Літвы, Польшчы пры змене межаў; іншыя выехалі добраахвотна, прымусова.

**Літаратура:** 1. Беларусазнаўства: Навуч. дапам. /Пад рэд. П. Брыгадзіна. – Мінск, 1997; 2. Беларусы: Атлас. – Мінск, 1996; 3. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША. – Мінск, 1993; 4. Раков, А.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Население БССР. – Минск, 1969; 5. Сяргеева Г.Г., Папоўская Т.А. Беларуская дыяспара //БЭ. – Т. 18. – Кн. 2. – Мінск, 2004; 6. Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі / В.С. Цітоў. – 2-ое выд. – Мінск: Беларусь, 2001. 7. Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяння: папулярны нарыс з гісторыі Беларусі /Пасьл. А. Грыцкевіча; укл. Н. Дашкевіч. – Менск: Навука і тэхніка, 1993. 8. Насельніцтва //БЭ. – Т.18. – Кн. 2. – Мінск, 2004. 9. Шарухо, И.Н. География белорусской диаспоры //Регіон–2007: Стратегія оптимального розвитку. Матеріали міжнародної наук.-практич. конференції, 17–18 квітня 2007 р., м. Харьків /Гол. ред. кол. В.С. Бакиров //РВВ ХНУ. – Харьків, 2007. – С. 150–152.

***Артыкул паступіў у рэдакцыю 5 студзеня 2013 г.***